Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 4. С. 15–19.

УДК 94(476)“1611/1617”

# АДНОСІНЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ СА ШВЕЦЫЯЙ У 1611–1617 ГГ.

**А. В. Дзямідовіч,**
*кандыдат гістарычных навук,
дацэнт кафедры
міжнародных адносін БДУ*

UDC 94(476)“1611/1617”

# THE RELATIONS BETWEEN THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH AND THE SWEDISH KINGDOM IN 1611–1617

**A. Dzemidovich,**
*Candidate of History,
Associate Professor of the Department
of International Relations, BSU*

Паступіў у рэдакцыю 01.11.17.

Received on 01.11.17.

У артыкуле разглядаюцца адносіны паміж Рэччу Паспалітай і Шведскім Каралеўствам у 1611–1617 гг. У гэты час паміж дзяржавамі не было вайны, паколькі дзейнічала перамір’е. Асаблівая ўвага ўдзяляецца палітычнай пазіцыі Вялікага Княства Літоўскага. На аснове крыніц паказана негатыўнае ўспрыняцце шляхтай Княства ідэі вайны са Швецыяй. Прадстаўнікі Вялікага Княства Літоўскага раілі свайму манарху адмовіцца ад прэтэнзій і завяршыць канфлікт са Шведскім Каралеўствам шляхам падпісання мірнага дагавора. Дадзеная пазіцыя тлумачыцца клопатам аб бяспецы Княства і Рэчы Паспалітай, а канфлікт са Швецыяй разглядаўся шляхтай Княства як задавальненне асабістых амбіцый манарха.

*Ключавыя словы:* Рэч Паспалітая, Вялікае Княства Літоўскае, Швецыя, вайна, перамір’е, шляхта, манарх.

The article focuses on the relations between the Polish-Lithuanian Commonwealth and the Swedish Kingdom in 1611 – 1618. At this time there was no war between the states as a truce had been signed. Special attention is paid to the political position of the Grand Duchy of Lithuania. The sources witness the negative acceptance by the gentry of the Duchy the idea of war with Sweden. The representatives of the Grand Duchy of Lithuania advised their monarch to give up his claims and to end the conflict with the Swedish Kingdom by means of concluding a peace treaty. This position is explained by the worries about the security of the Duchy and the Polish-Lithuanian Commonwealth, and the conflict with Sweden was considered by the gentry of the Duchy as the satisfaction of the personal ambitions of the monarch.

*Keywords:* the Polish-Lithuanian Commonwealth, the Grand Duchy of Lithuania, Sweden, war, truce, gentry, monarch.

*Уводзіны.* Адносіны паміж Рэччу Паспалітай і Шведскім Каралеўствам у XVII ст. былі складанымі і характарызаваліся канфліктнасцю. Асабліва характэрным у гэтым плане з’яўляецца перыяд першай трэці XVII ст., які ў айчыннай гістарыяграфіі называецца «вайной 1600–1629 гг.». У польскай жа гістарыяграфіі канфрантацыя дзвюх дзяржаў у адзначаны перыяд класіфікуецца як шэраг войнаў: 1600–1611 гг.; 1617–1618 гг.; 1621–1622 гг.; 1625–1629 гг. Якой бы мы ні кіраваліся гістарыяграфічнай традыцыяй з вышэйпералічаных (адна вайна альбо некалькі), зразумела, што для гэтага перыяду характэрны і этапы адноснага мірнага суіснавання Рэчы Паспалітай і Швецыі. Да гэтага ліку належыць і храналагічны прамежак 1611–1617 гг.: ад падпісання перамір’я да аднаўлення ваенных дзеянняў. Дадзены перыяд вылучаецца яшчэ і на той падставе, што ў гэты час выразна выкрышталізоўваецца думка палітычна актыўнай часткі грамадства Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) аб неабходнасці канчаткова вырашыць канфікт са Швецыяй мірным шляхам: з дапамогай саюзаў і пагадненняў. Такая пазіцыя адрознівалася ад пазіцыі шляхты ВКЛ у папярэдні час (1600–1611 гг.), калі канфлікт са Швецыяй інтэрпрэтаваўся грамадствам ВКЛ як абарончая вайна.

Супрацьстаянне паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй, якое пачалося ў апошнім дзесяцігоддзі XVI ст. як дынастычная барацьба, прыцягвала ўвагу даследчыкаў. У першую чаргу варта ўзгадаць працы польскага гісторыка Г. Віснера [1–5], а таксама літоўскіх даследчыкаў Б. Дундуліса [6], А. Ціла [7]. Сярод даследаванняў шведскай гістарыяграфіі

Рэпазіторый БДПУ

можна вылучыць працы, прысвечаныя войнам Рэчы Паспалітай са Швецыяй, а таксама перыяду кіравання Жыгімонта III Вазы [8; 9]. Заўважым, што больш даследаваліся актыўныя ваенныя дзеянні, чым перыяды перамір'яў. Няшмат звярталася ўвагі на пазіцыю ВКЛ у канфлікце Рэчы Паспалітай і Швецыі. Між тым вывучэнне пазіцыі Княства адносна знешнепалітычнага курсу Рэчы Паспалітай у адзначаны перыяд мае важнае значэнне і абумоўлена патрэбай асэнсавання ўплыву дадзенай дзяржаўнай адзінкі на ход падзей, якія ў далейшым абумовіў новы расклад сіл у рэгіёне.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца адносіны Рэчы Паспалітай і Швецыі ў 1611–1617 гг. Прадметам – пазіцыя шляхты ВКЛ адносна стасункаў Рэчы Паспалітай са Швецыяй у адзначаны перыяд.

Мэта артыкула – вызначэнне стаўлення палітычнага народа ВКЛ да адносін Рэчы Паспалітай са Швецыяй падчас «безваеннага» перыяду 1611–1617 гг.

*Асноўная частка.* Пазіцыя шляхты ВКЛ адносна праблемы ўзаемастасункаў Рэчы Паспалітай са Швецыяй у перыяд 1611–1617 гг. адлюстравана ў дакументальных і апавядальных гістарычных крыніцах. Падчас напісання артыкула выкарыстоўваліся дакументы справаводчага і эпісталярнага характару, што дазволіла атрымаць уяўленне аб стаўленні вышэйшага саслоўя ВКЛ да акрэсленай праблемы.

Канфлікт Рэчы Паспалітай са Швецыяй, які азнаменаваў першае дзесяцігоддзе XVII ст., быў часова спынены перамір'ем 1611 г. Аднак гэта не прынесла спакою грамадству ВКЛ, якое асцерагалася аднаўлення ваенных дзеянняў з боку Швецыі. Больш таго, заключэнне перамір'я справакавала негатыўнае стаўленне асобных магнатаў да самога факта яго падпісання. Так, наступны каментарый да гэтага перамір'я ўтрымлівае ліст Януша Радзівіла да Льва Сапегі, датаваны 3 мая 1611 г.: «У Інфлянтах перамір'е на некалькі гадоў заключана ... Калі гэта можна адным без згоды станаў пачынаць і заканчваць войны па ўласным жаданні, тады я так разумею, што ў хуткім часе ў нас народзіцца дастаткова такіх дыктатараў, якія таксама моц сабе ўзурпаваць будуць, асабліва ў нашай Рэчы Паспалітай, якая роўнасць любіць» [10, k. 15]. Безумоўна, тут бачна алюзія на развязванне вайны Жыгімонтам III з Расіяй у 1609 г. без санкцыі сойма Рэчы Паспалітай. Дарэчы, гэта вайна з Расіяй, якая ў 1611 г. дасягнула свайго апагея, была найгалоўнейшым знешнепалітычным клопатам Рэчы Паспалітай на той момант. У некаторай ступені пераважала яна і над «шведскім» пытаннем. Тым не менш для шляхты ВКЛ праблема гарантыі міру з боку Швецыі з'яўлялася надзённай: перамір'ю са шведамі ВКЛ не давярала.

Доказам гэтага з'яўляецца настрой шляхты ВКЛ падчас перадсоймавай кампаніі 1611 г., што знайшло адлюстраванне ў соймікавых інструкцыях. Шляхта Мінскага ваяводства характарызавала перамір'е, заключанае з Карлам Судэрманскім, як «сумніўны мір» і даручала сваім паслам «супольнай радай дапамогу з іх міласцямі панамі палякамі абмяркоўваць». Прычым падкрэслівалася, што на сойме неабходна такім чынам абмеркаваць пытанне, «каб там надзейная абарона супраць непрыяцеля падрыхтавана была» [11]. Віленскі павет выказаўся вельмі лаканічна: «Бяспеку зямлі Інфлянцкай пільна сцерагчы» [12, арк. 4]. Салідарнай з гэтым была пазіцыя і Жамойцкага княства [13, k. 219–223].

Нягледзячы на непапулярнасць вайны сярод грамадства Рэчы Паспалітай, Жыгімонт III Ваза, аднак, не збіраўся адмаўляцца ад амбіцый вярнуць страчаныя пазіцыі ў Швецыі. Напярэдадні сойма 1613 г. манарх рассылае лісты да сенатараў, у якіх, між іншым, просіць падтрымкі на сойміках у справе барацьбы за свае спадчынныя правы на шведскі прастол [14, s. 30]. Аднак шляхта ВКЛ не выказала агрэсіўных памкненняў, і, у прынцыпе, рашэнні соймікаў былі не на карысць Жыгімонту III. У якасці прыярытэту знешняй палітыкі шляхта ВКЛ ставіла бяспеку Рэчы Паспалітай. Як прыклад, шляхта Вількамірскага павета, ацэньваючы міжнародную сітуацыю, асцерагалася таго, каб у выніку шведска-дацкага пагаднення Рэч Паспалітая не падверглася агрэсіі на паўночным кірунку [15, арк. 1]. Інструкцыі ж на надзвычайны сойм 1613 г. не засяроджвалі асаблівай увагі на дадзенай праблеме, што было зразумела: асноўным пытаннем, якое мусіў абмеркаваць сойм, было ўхваленне новых падаткаў на вайну з Расіяй. Тым не менш інструкцыя Віленскага ваяводства даручала сваім паслам дамагацца на сойме таго, каб «саюз са шведамі быў заключаны» [16, арк. 2].

У студзені 1614 г. Рэч Паспалітая працягнула перамір'е са Швецыяй да кастрычніка 1616 г. Аднак часовы характар дагавора

Рэпазіторый БДПУ

выклікаў непакой. Падчашы ВКЛ Януш Радзівіл папярэджваў гетмана польнага Крыштофа Радзівіла, каб той быў асцярожным у інфлянцкіх справах. У кастрычніку 1614 г. ён пісаў да брата: «Гэты малады швед (Густаў II Адольф – *А. Д.*) больш тонка ў справах ідзе, чым бацька, і слова такое ўсюды ў іншых сам краінах мае, што яго мала чым ніжэйшым ад Аляксандра Вялікага (але я не ведаю, дзе і калі на гэтую славу зарабіў) прызнаюць» [10, k. 30]. Інфармаваў таксама, што Густаву II у 1613 г. была дадзена ў распараджэнне невялікая колькасць жаўнераў з-за мяжы і што пасол яго на прапанову атрымаць больш адказаў, што «на такую гатоўнасць, якую мае польскі кароль для вяртання Швецыі, пан яго на той час больш не патрабуе» [10, k. 30]. Відавочна, што ва ўяўленні шведскага караля Рэч Паспалітая не прадстаўляла сур'ёзнай пагрозы.

Для ВКЛ у 1614 г., нягледзячы на працягнутае перамір'е, пагроза з боку Швецыі паранейшаму з'яўлялася актуальнай. Інструкцыя Жамойці з сойміку ў Расейнах на віленскую канвакацыю, датаваная 10 верасня 1614 г., адзначыла: «Са шведамі міру надзейнага не маем». Падкрэслівалася неабходнасць накіраваць з гэтай канвакацыі паслоў да манарха і прасіць, каб ён, «звярнуўшы ўвагу на небяспекі, якія наступаюць адусюль... раней часу мір заключыў...» [17, nr 219, s. 904–905]. Закраналася праблема належнага забеспячэння «інфлянцкіх» замкаў – Дорпта, Марыенбурга, Парнавы, Дыямента. Падкрэслівалася значнасць гэтых пунктаў: дзякуючы сваёй лакалізацыі, яны з'яўляюцца перашкодай для праціўніка. Было заўважана, што згубіць іх лёгка, а назад вярнуць будзе праблематычна [17, nr 219, s. 905].

Віленская канвакацыя, якая адбылася ў кастрычніку 1614 г., узняла найважнейшыя пытанні, якія хвалявалі шляхецтва ВКЛ. Сярод іх была і абарона дзяржавы. Погляд на гэту праблему знайшоў адлюстраванне ва ўхвале з'езда: «Грунтоўна, аднак, Рэчы Паспалітай супакаення не бачым, каб інакш быць магло, толькі праз атрыманне саюза і міру, не толькі ад маскоўскіх межаў, але і з Інфлянтаў, дзе і тыя перамір'і на слабай нітцы і ненадзейныя. Пільна просім караля я.м., каб канчаткова адмовіўшыся ад усіх страчаных магчымасцей, усе сілы і намаганні свае да таго прыклаў, каб мы як мага хутчэй жаданым мірам былі ўзрадаваны» [18, s. 187].

Каралеўская перадсоймавая інструкцыя ад 18 лістапада 1614 г. звяртала ўвагу на небяспеку, якую ўяўляла Швецыя ў асобе караля Густава II Адольфа для інтарэсаў Рэчы Паспалітай. Шляхце для роздуму была прадстаўлена інфармацыя, што сын Карла Судэрманскага стаў на «дарогу перамог»: «...у зямлі Маскоўскай з войскам нямалым... узяў некалькі замкаў, апанаваў Вялікі Ноўгарад...Таму трэба і нам на задумы яго азірацца» [19, nr 7, s. 41]. Не мог не закрануць Жыгімонт III пытання аб шведскай кароне. У інструкцыі паведамлялася, што ўсе астатнія дзяржавы дзівяцца, як можа далей цярпець гэты народ (падданыя РП – *А. Д.*) непавагу свайго манарха ў яго спадчынным каралеўстве [19, nr 7, s. 43].

Шляхта Ковенскага павета ў соймікавай інструкцыі, датаванай 3 студзеня 1615 г., абвяргала меркаванне караля адносна таго, што яна не бачыць і не ўспрымае належным чынам «крыўды яго каралеўскай міласці». Але спасылалася на перамір'е са Швецыяй і ўвогуле наказвала сваім паслам дамагацца, «каб у далейшым мір з тым, з кім мы знаходзімся на гэты час у ваенным стане, атрымалі» [20, арк. 3]. Ашмянская шляхта адзначыла, што не патрэбна ігнараваць шведскай пагрозы, і таму лепш захаваць перамір'е [21, арк. 3]. Скліканы на 29–31 студзеня 1615 г. галоўны соймік у Слоніме падсумаваў настроі шляхты ВКЛ адносна неабходнасці бяспекі ў Інфлянтах, выказаўшыся за тое, каб там «мір саюзам быў пастаноўлены» [18, s. 204].

Не змянілася стаўленне шляхты ВКЛ і ў 1616 г. Рашэнні соймікаў ВКЛ, скліканых ў сакавіку 1616 г., былі не на карысць Жыгімонту III у справе вяртання Шведскага Каралеўства. Слонімскі павет выказаўся па гэтым пытанні наступным чынам: «Жадаем таго, каб я. к. м. спадчыну сваю, Шведскае Каралеўства, вярнуў і сам ім валодаў. Але зараз мы з усіх бакоў вялікімі небяспекамі ахоплены, як ад Масквы, так і ад паганцаў, турка і татараў... і так мы вельмі змучаны, знішчаны, што ўсіх небяспекаў пераадолець не зможам. Прасіце і дамагайцеся паслы нашы, каб я. к. м. са шведамі мір і саюз які часовы заключыць загадаў, каб мы спачатку з Масквой разабраліся, і татар супакоілі, і гарантавалі бяспеку, і пасля гэтых вялікіх шкодаў нашых перадыхнулі» [19, nr 103, s. 615]. Такім чынам, шляхта рэзюміравала, што не варта зараз са шведамі ўступаць у канфлікт, пакуль «з Ма-

Рэпазіторый БДПУ

сквой і з паганцамі міру і бяспекі не маем» [19, nr 103, s. 615].

Негатыўна выказалася адносна намераў манарха і віленская канвакацыя 1617 г. Пастанова галоўнага з’езда ад 27 красавіка 1617 г. утрымлівала просьбу шляхецкага стану ВКЛ, каб Жыгімонт III адкінуў свае дынастычныя прэтэнзіі адносна Швецыі і заключыў з ёю дагавор. Гучала скарга, дарэчы не першая, што ВКЛ адно, без дапамогі палякаў, нясе ўвесь цяжар вайны [18, s. 220–221].

Тым часам знешнепалітычная сітуацыя складвалася неспрыяльна для Рэчы Паспалітай і Жыгімонта III Вазы. Шведскае Каралеўства завяршыла вайну з Даніяй. 27 лютага 1617 г. Густаў Адольф заключыў у Сталбове мір з Расіяй на дастаткова выгадных для яго ўмовах: Швецыя атрымала ўзбярэжжа над Фінскім залівам [22, s. 264]. Шведскі кароль лічыў гэту дамову вялікім поспехам сваёй знешняй палітыкі [23, s. 50–51], і ўрадавыя колы Швецыі меркавалі, што наступіў дастаткова зручны час, каб рэалізаваць свае тэрытарыяльныя прэтэнзіі адносна Інфлянтаў.

У ліпені 1617 г. Швецыя аднаўляе ваенныя дзеянні супраць Рэчы Паспалітай. Выказаныя ВКЛ асцярогі сталіся рэчаіснасцю. Рэч Паспалітая сустрэла напад шведаў не падрыхтаванай належным чынам, што можна часткова патлумачыць наступным. Склалася парадаксальная сітуацыя: з аднаго боку, для Жыгімонта III Вазы шведскі вектар быў, безумоўна, прыярытэтным; з іншага – ён не знаходзіў належнай увагі, каб быць паспяхова рэалізаваным.

*Заключэнне.* Такім чынам, нават пасля заключэння перамір’я 1611 г. шляхту ВКЛ паралельна з непакоем аб урэгуляванні стасункаў з Расійскай дзяржавай хвалявала пытанне адносін Рэчы Паспалітай са Швецыяй. На сойміках гучалі заклікі да захавання міру і адначасова ўмацавання паўночных межаў дзяржавы, прыватны інтарэс Жыгімонта III Вазы – вяртанне спадчыннай кароны – не знаходзіў належнага спачування з боку шляхты.


### Літаратура

1. *Wisner, H.* Kampania Inflancka Krzysztofa Radziwiłła w latach 1617–1618 / H. Wisner // Zapiski hist. : poświęcone historii Pomorza i krajów Bałtyckich. – 1970. – T. 35, Z. 1. – S. 9–35.
2. *Wisner, H.* Kircholm, 1605 / H. Wisner. – Warszawa : Wydaw. Min. Obrony Nar., 1987. – 150 s.
3. *Wisner, H.* Opinia szlachecka Rzeczypospolitej wobec polityki szwedzkiej Zygmunta III w latach 1587–1632 / H. Wisner // Zapiski Hist. – 1973. – T. 38, z. 2. – S. 9–50.
4. *Wisner, H.* Rozejm w Baldenmojzie (1627) / H. Wisner // Lietuva ir jos Kaimynai. Nuo normanų iki Napoleono : straipsniu rinkinys / B. Dundulis [et al.] ; vyr. red. I. Valikonyte ;Vilniausuniv. – Vilnius, 2001. – S. 266–277.
5. *Wisner, H.* Wojna Inflancka 1625–1629 / H. Wisner // Studia i materiały do historii wojskowości. – 1970. – T. 16, Cz. 1. – S. 27–94.
6. *Dundulis, B.* Švedų feodalų įsiveržimai į Lietuvą XVII – XVIII a. / B. Dundulis. – Vilnius : Mokslas, 1977. – 175 p.
7. *Tyla, A.* Lietuva ir Livonija XVI a. pabaigoje – XVII a. pradžioje / A. Tyla ; Liet. TSR MA Ist. inst. – Vilnius : Mokslas, 1986. – 219 p.
8. *Norberg, A.* Polen i svensk politik, 1617–1626 / A. Norberg. – Stockholm : Almqvist&Wiksell, 1974. – 323 p.
9. *Norrman, D.* Sigismund Vasa och hans regering i Polen (1587–1632) / D. Normann. – Stockholm : P. A. Norstedt&Sönersförlag, 1978. – 272 p.
10. Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu. – Rkps. 1851/I. “Listy różne Janusza Radziwiłła [...] do Krzysztofa Radziwiłła, brata swego i doinnych, pisane w latach 1607–1618”.
11. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). – Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dz. II – nr 565. Instrukcja powiatu Mińskiego, dana posłom na sejm (1611).

### References

1. *Wisner, H.* Kampania Inflancka Krzysztofa Radziwiłła w latach 1617–1618 / H. Wisner // Zapiski hist. : poświęcone historii Pomorza i krajyw Bałtyckich. – 1970. – T. 35, Z. 1. – S. 9–35.
2. *Wisner, H.* Kircholm, 1605 / H. Wisner. – Warszawa : Wydaw. Min. Obrony Nar., 1987. – 150 s.
3. *Wisner, H.* Opinia szlachecka Rzeczypospolitej wobec polityki szwedzkiej Zygmunta III w latach 1587–1632 / H. Wisner // Zapiski Hist. – 1973. – T. 38, z. 2. – S. 9–50.
4. *Wisner, H.* Rozejm w Baldenmojzie (1627) / H. Wisner // Lietuva ir jos Kaimynai. Nuo normanų iki Napoleono : straipsniu rinkinys / B. Dundulis [et al.] ; vyr. red. I. Valikonyte ;Vilniausuniv. – Vilnius, 2001. – S. 266–277.
5. *Wisner, H.* Wojna Inflancka 1625–1629 / H. Wisner // Studia i materiały do historii wojskowości. – 1970. – T. 16, Cz. 1. – S. 27–94.
6. Dundulis, B. Љvedų feodalų įsiverћimai į Lietuvą XVII – XVIII a. / B. Dundulis. – Vilnius : Mokslas, 1977. – 175 p.
7. *Tyla, A.* Lietuva ir Livonija XVI a. pabaigoje – XVII a. pradћioje / A. Tyla ; Liet. TSR MA Ist. inst. – Vilnius : Mokslas, 1986. – 219 p.
8. *Norberg, A.* Polen i svensk politik, 1617–1626 / A. Norberg. – Stockholm : Almqvist&Wiksell, 1974. – 323 p.
9. *Norrman, D.* Sigismund Vasa och hans regering i Polen (1587–1632) / D. Normann. – Stockholm : P. A. Norstedt&Sųnersfųrlag, 1978. – 272 p.
10. Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu. – Rkps. 1851/I. “Listy ryżne Janusza Radziwiłła [...] do Krzysztofa Radziwiłła, brata swego i doinnych, pisane w latach 1607–1618”.
11. Archiwum Gływne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). – Archiwum Radziwiłływ (AR). – Dz. II – nr 565. Instrukcja powiatu Mińskiego, dana posłom na sejm (1611).


Рэпазіторый БДПУ

12. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 561. Instrukcja powiatu Wileńskiego, dana posłom na sejm (17 sierpnia 1611).
13. Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Umiejętności i Polskiej Akademii Nauk w Krakowie (BPANKr). – Rkps. 360. Papiery publiczne Chodkiewiczów 1571–1672. / Listy, akty, nadania /.
14. *Byliński, J.* Dwasejmy z roku 1613 / J. Byliński. – Wrocław : Wydaw. Uniw. Wrocławskiego, 1984. – 279 s.
15. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 588. Instrukcja powiatu Wiłkomirskiego, dana posłom na sejm (styczeń 1613).
16. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 593. Instrukcja województwa Wileńskiego, dana posłom na sejm wanly warszawski (3 grudnia 1613).
17. Biblioteka Muzeum Narodowego im. Czartoryskich w Krakowie (BCzart). – Rkps. 108. Teki Naruszewicza. T. 108 (1613–1614).
18. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego : w 2 t. / oprac. H. Lulewicz. – Warszawa : Neriton, 2006–2009. – T. 2 : Okresy panowań królów elekcyjnych, XVI–XVII wiek / Inst. Historii Pol. Akad. Nauk; oprac. H. Lulewicz. – 2009. – 452 s.
19. BCzart. – Rkps. 109. Teki Naruszewicza. T. 109 (1615–1616).
20. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 621. Instrukcja powiatu Kowieńskiego, dana posłom na sejm wanly warszawski (3 stycznia 1615).
21. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 620. Instrukcja powiatu Oszmiańskiego, dana posłom na sejm (2 stycznia 1615).
22. *Szelągowski, A.* Sprawa północna w wiekach XVI i XVII : w 3 cz. / A. Szelągowski. – Lwów : Nakł. Księg. Pol. B. Połonieckiego ; Warszawa : Gebethner i Wolff, 1904–1905. – Cz. 1 :Walka o Bałtyk. – 1904. – 399 s.
23. *Szaskolskij, I. P.* Cele wojen szwedzkich przeciwko Rosji w XVI i początkach XVII w. / I. P. Szaskolskij // Zapiski hist. :poświęcone historii Pomorza i krajów Bałtyckich. – 1975. – T. 40, z. 2. – S. 37–54.



12. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 561. Instrukcja powiatu Wileńskiego, dana posłom na sejm (17 sierpnia 1611).
13. Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Umiejętności i Polskiej Akademii Nauk w Krakowie (BPANKr). – Rkps. 360. Papiery publiczne Chodkiewiczyw 1571–1672. / Listy, akty, nadania /.
14. *Byliński, J.* Dwasejmy z roku 1613 / J. Byliński. – Wrocław : Wydaw. Uniw. Wrocławskiego, 1984. – 279 s.
15. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 588. Instrukcja powiatu Wiłkomirskiego, dana posłom na sejm (styczeń 1613).
16. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 593. Instrukcja wojewydztwa Wileńskiego, dana posłom na sejm wanly warszawski (3 grudnia 1613).
17. Biblioteka Muzeum Narodowego im. Czartoryskich w Krakowie (BCzart). – Rkps. 108. Teki Naruszewicza. T. 108 (1613–1614).
18. Akta zjazdyw stanyw Wielkiego Księstwa Litewskiego : w 2 t. / oprac. H. Lulewicz. – Warszawa : Neriton, 2006–2009. – T. 2 : Okresy panowań krylyw elekcyjnych, XVI–XVII wiek / Inst. Historii Pol. Akad. Nauk; oprac. H. Lulewicz. – 2009. – 452 s.
19. BCzart. – Rkps. 109. Teki Naruszewicza. T. 109 (1615–1616).
20. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 621. Instrukcja powiatu Kowieńskiego, dana posłom na sejm wanly warszawski (3 stycznia 1615).
21. AGAD. – AR. – Dz. II. – nr 620. Instrukcja powiatu Oszmiańskiego, dana posłom na sejm (2 stycznia 1615).
22. *Szelągowski, A.* Sprawa pyłnocna w wiekach XVI i XVII : w 3 cz. / A. Szelągowski. – Lwyw : Nakł. Księg. Pol. B. Połonieckiego ; Warszawa : Gebethner i Wolff, 1904–1905. – Cz. 1 :Walka o Bałtyk. – 1904. – 399 s.
23. *Szaskolskij, I. P.* Cele wojen szwedzkich przeciwko Rosji w XVI i początkach XVII w. / I. P. Szaskolskij // Zapiski hist. :poświęcone historii Pomorza i krajyw Bałtyckich. – 1975. – T. 40, z. 2. – S. 37–54.


Рэпазіторый БДПУ